# Красавік

**Palina**

Красавік месяц прыйшоў
Абарваў каляндар менш паловы лістоў
Зьмянілася нешта ў прыродзе
А люты неяк нешта з сэрца ня сходзіць
Аўторак, чацьвер, серада
Ня варта які дзень – сутнасьць адна
Дзе ты
Дзе я

Мне казалі што ўсё зьменіцца
Толькі год ці два, ды ўжо ня верыцца
Мне казалі будзе лепшы час
Толькі для каго? Толькі не для нас
Трэба забываць, трэба крэсьліць ўсё
Проста вам казаць: “Забівай любоў”
Буду сумаваць ноччу, трошкі днём
Не магу пакуль інакш, не магу ды ўсё

А ці ёсьць сэнс не кахаць
Не ўздыхаць вельмі цяжка ды не чакаць
Онлайн
Я напрыклад лічу што ня мае
Сінія вочы буду шукаць
У натоўпе людзей ды ўспамінаць часьцей
Той час калі ў зімку квітнела зямля

Мне казалі што ўсё зьменіцца
Толькі год ці два, ды ўжо ня верыцца
Мне казалі будзе лепшы час
Толькі для каго? Толькі не для нас
Трэба забываць, трэба крэсьліць ўсё
Проста вам казаць: “Забівай любоў”
Буду сумаваць ноччу, трошкі днём
Не магу пакуль інакш, не магу ды ўсё

Мне казалі што ўсё зьменіцца
Толькі год ці два, ды ўжо ня верыцца
Мне казалі будзе лепшы час
Толькі для каго? Толькі не для нас
Трэба забываць, трэба крэсьліць ўсё
Проста вам казаць: “Забівай любоў”
Буду сумаваць ноччу, трошкі днём
Не магу пакуль інакш, не магу ды ўсё

Tištěno z pisnicky-akordy.cz Sponzor: www.srovnavac.cz - vyberte si pojištění online!